№ 203 (325)
Субота, 15 лістапада 1997 г.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і кромах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

Lintec Computer
Газета сверстана на компьютерах фирмы "ЛИНТЕК".

BelPaper
Крупнейший поставщик бумаги и картона от шведских и финских производителей на Беларуси.
Тел. (017) 223-28-33.

Сонца

	Усход	Захад
Віцебск	7.32	15.57
Магілёў	7.26	16.02
Гомель	7.17	16.05
Мінск	7.36	16.12
Гродна	7.51	16.29
Брэст	7.45	16.35

Першая квадра 21 лістапада

Пейджинговую связь редакции обеспечивает компания МОБИЛКОМ пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

Лампы. Кабель. Светильники. Прожекторы. Электрооборудование. 8-(017)-213-70-13
Кальченко & К°

Личное мнение

Владимир НИСТЮК, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, секретарь ЦК Социал-демократической партии (Народная грамада)

Осенняя распутица белорусской оппозиции, или Почему не надо бить своих, чтобы чужие боялись

На смену теплым летним денькам пришла дождливая осенняя пора. Птицы от холодов потянулись на юг. Президент Беларуси от претензий собственного голодного народа и заслуженных упреков оппозиции снова потянулся на Восток. От правового и экономического беспредела режима белорусские и российские деловые люди с их капиталами потянулись на Запад. Политики, укрывшись в неотапливаемых или плохо отапливаемых квартирах от нападок правоохранительных органов, потянулись к бумаге и ручкам и принялись за придирчивый анализ итогов первой годовщины белорусского скандала, завершившегося переустройством общества "под одного человека".

Первые выводы для многих из них стали неожиданными. Оказалось, что в наиболее благоприятных условиях для наращивания согласованной деятельности белорусской оппозиции некоторые ее известные политики почему-то включились с помощью негосударственной прессы в выяснение личных отношений и в борьбу за лидерство.

Прежде всего хотелось бы несколько точнее определиться с понятием "оппозиция". Думается, что большую политическую и правовую ошибку совершают те, кто в стратегическом смысле называет оппозицией избранный народом Верховный Совет Республики Беларусь 13-го созыва.

Наверное, правильнее называть оппозицией законной власти тех, кто через сомнительные результаты так называемого референдума, через обман общества и всего мира, через давление и подкуп части депутатов и подневольных руководителей вертикали силой, беспардонно устранил действующий парламент и подменил его полуфабрикатом, изготовленным на грязной фабрике — кухне печально знаменитого "повара" из далеко не свежих политических продуктов, что грозит значительной части наших граждан в лучшем случае несварением желудка, а в худшем — непрекращающимся его расстройством. Эти с позволения сказать политики и поддерживающие их микропартии поставили себя в оппозицию закону и законным органам власти.

Но уж коль скоро мы привыкли к действующим формулировкам, то не стану отходить от установившихся традиций. Действительно, созданному режиму и его опорам — псевдопарламенту и прикарманенной судебной ветви власти — в республике создана оппозиция, которую и имеют в виду политики и журналисты прежде всего при оценке группы депутатов, оставшихся верными Конституции 1994 года, а также всех наиболее влиятельных и авторитетных политических партий, не признающих результатов политической акции образца ноября 1996 года. Именно эту, а не выше упомянутую оппозицию малофеевых и коноплевых почему-то в последнее время некоторые журналисты и даже целые издания с непонятной целью избрали главным объектом своей критики, причем зачастую переходящей в хамство.

В чем же дело? Только ли в том, что за это не посадят, как Павла Шеремета, не арестуют, как Ирину Халип или Валерия Щукина? Может, это никак не связано с перспективой получения с барского плеча какого-нибудь послабления от всемогущей власти. Слишком гордые и умные люди ввязались в это дело. Не хочется верить и в то, что ими движет простое желание получить за свою работу вкусный бутерброд с всемирно известным маргарином "Rama" и какого-нибудь цвета икрой. Но уж настолько начинают некоторые служители независимых массмедиа напоминать зимовских и ковалевых, что хочется засомневаться в их независимости. Именно для поиска ответа на эти непростые вопросы видится необходимым, не претендуя на истину в последней инстанции, предложить свое видение ситуации в лагере оппозиционеров и оппозиционной прессы в канун годовщины переворота.

Не будет обманом читателя напоминание о том, что в первые месяцы после ноября 1996 года негосударственная пресса не обижала оппозиционных режиму Лукашенко политиков. Видимо, всем журналистам было понятно, что эти люди действительно предпочли жирным кускам с государева стола борьбу за правду, за справедливость, за Его Величество Закон. Они пошли под милицейские дубинки и на громкие суды совсем не из-за того, чтобы вернуться в уютные кабинеты Дома правительства к государственным кормушечным корытам. В ущерб себе, своим родным и близким, не рассчитывая на скорую и бескровную победу над режимом, они впрягались в неблагодарную, опасную, но очень нужную для страны и ее народа кропотливую рутинную работу. Достаточно сказать, что из 49 попавших в опалу власти депутатов Верховного Совета 13-го созыва устроиться на работу после референдума заново смогли только 4 человека. Причем трое из них работают в коммерческих структурах, и только одному В.Гончару удалось получить новое место на прежней работе. Пока держатся на прежних местах, в том числе и в двух государственных структурах, только 7 человек.

Оставшиеся 37 человек стали изгоями в своем Отечестве. Госчиновники боятся брать их на работу из-за боязни потерять свое место, коммерческие структуры опасаются мстительного прессинга многочисленных контрольных органов, созданных президентом. Такая же судьба, к сожалению, постигает многих жен и детей непослушных "батьке" парламентариев. В самом начале борьбы никто не мог дать даже белорусского "зайчика" за судьбу опальных депутатов. Восемь из них прошли через лукашенковские суды. Тогда нечего было делить, кроме сумм штрафов, которые наложили на оппозиционеров эти подневольные структуры. Начались следственные действия в отношении членов специальной комиссии по правовой оценке нарушений А.Лукашенко Конституции и законов Республики Беларусь.

Видимо, от очевидной эффективности работы депутатской группы наезды на ее членов осуществлялись тогда только со стороны хорошо подкармливаемых пропрезидентских средств массовой информации. Иная ситуация сложилась к осени 1997 года, к годовщине политического переворота в Беларуси. Совместными усилиями всех оппозиционных режиму сил удалось донести правду о ситуации в нашей стране до международного сообщества. Многое здесь сделали депутаты С.Шарецкий, М.Гриб, П.Кравченко, А.Лебедько, С.Калякин, О.Абрамова, Г.Карпенко. Причем синяки и шишки от лукашенковских ударов демонстрировались перед зарубежными политиками только на первых порах прежде всего по причине ликвидации сдерживающих диктатуру органов внутри республики. После того как к Беларуси было привлечено всеобщее внимание, представители международных организаций в результате личных посещений сами дали заслуженную оценку диктатуре, как, например, миссия А.Косто.

(Окончание на 2-й стр.)

Горкая праўда

Ці паважаюць у нас працу хлебароба?

16 лістапада — Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу

Свята работнікаў сельскай гаспадаркі — гэта той дзень, калі чыноўнікі розных рангаў звычайна клянуцца ў сваёй любові да хлебаробаў, гавораць на іх адрас прыгожыя словы.

А мне хочацца сказаць праўду.

Бо ў мяне складваецца ўражанне, што ў нас не надта паважаюць хлебароба і яго працу. Каб паважалі, дык і плацілі б. А то за работу з досвітку і да змяркання даюць капейкі. Так, сярэдні заробак калгаснікаў у жніўні сёлетняга года склаў 1 мільён 447 тысяч рублёў. А мінімальны спажывецкі бюджэт пераваліў ужо за 2 мільёны. Гэта значыць, што працаўнік палёў і ферм не ў стане на такія грошы пракарміць самога сябе. А за што карміць дзяцей?

У той жа час работнікі мытняў у жніўні атрымалі ў сярэднім па 3 мільёны 681 тысячы рублёў, міжгаліновых органаў дзяржаўнага кіравання — па 4 мільёны 873 тысячы, банкаў — па 4 мільёны 619 тысяч рублёў. Не малыя аклады ў праваахоўных органах і ў дзяржаўных чыноўнікаў, але пра іх ужо не паведамляюць у даведніках статыстыкі, відаць, каб не дражніць насельніцтва.

Ды і гэтыя мізэрныя грошы калгаснікі атрымліваюць з вялікім спазненнем, калі інфляцыя ўжо з'ядае добрую іх частку. Так, калі ў сярэднім па краіне запазычанасць па зарплаце складае 9,3% ад усяго фонда зарплаты, дык у калгаснікаў — 43,1%. У прамысловасці яна складае 4,2%, а ў Мінску і таго меней — 1,4%. Бо рабочыя, асабліва мінскіх прадпрыемстваў, пастаянна пагражаюць мітынгамі і забастоўкамі і такім чынам выбіваюць свае грошы.

Чаму калгаснік, які зранку і да вечара вырошчвае хлеб, павінен атрымліваць у два-тры разы меней за чыноўніка? Вось пра што варта было б пагаварыць у гэты дзень. І з экрана дзяржаўнага тэлебачання, і ў час урачыстых сходаў. Але не дачакаемся.

Як і пра тое, што калі ў 1990 годзе сельскія гаспадаркі набылі 10 тысяч аўтамабіляў, альбо ў сярэднім па 4 на кожны калгас і саўгас, дык летась дзесьці за трыста штук, альбо ўсяго па 2 на раён. У 1996 годзе куплены толькі 71 зернеўборачны камбайн. У сярэднім не хапае па аднаму на раён. Спецыялісты федэрацыі прафсаюзаў лічаць, што калі так пойдуць справы і далей, дык ужо ў 1999 годзе не будзе чым сеяць і ўбіраць.

Пры такіх адносінах і спад у сельскай гаспадарцы вялізны. На 1 студзеня 1991 года ў Беларусі было 7 мільёнаў 166 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку кароў 2 мільёны 439 тысяч галоў, свіней — 5 мільёнаў 203 тысячы. Цяпер жа мы маем кароў усяго 1 мільён 294 тысячы (амаль у 2 разы меней), свіней — 2 мільёны 279 тысяч (амаль у 2,5 раза меней). У 1990 годзе было закуплена 7 мільёнаў 405 тысяч тон малака. Сёлета за дзевяць месяцаў — 2 мільёны 312 тысяч тон. У тры разы меней.

У 1992 годзе ўраджайнасць збожжавых складала 34 цэнтнеры з гектара, у 1993 — 33, сёлета — 27 цэнтнераў. У 1992 годзе краіна сабрала 7,8 мільёна тон збожжа, у гэтым — 6,5 мільёна тон.

Нягледзячы на такі глыбокі крызіс і цяжкія ўмовы, хлебаробы ўвогуле папрацавалі слаўна. Яны, можна сказаць, сабралі ўвесь вырашчаны ўраджай. Дзякуючы іх самаадданай працы краіна будзе з хлебам, бульбай і малаком. У час уборачных работ мы называлі імёны перадавых камбайнераў, якія намалацілі па тысячы і болей тон збожжа, лепшых вадзіцеляў і работнікаў такой. І сёння варта яшчэ раз ад душы падзякаваць усім удзельнікам уборачнага канвеера — ад работнікаў Міністэрства да камбайнераў і сейбітаў за іх змагарную працу.

Дасягнутыя вынікі высвечваюць і вялізны патэнцыял, якім валодае наша вёска. У многіх гаспадарках і нават раёнах ураджайнасць збожжавых аказалася ў два разы вышэйшай, чым у сярэднім па краіне. Гэта значыць, што каб усе мелі такія магчымасці, як перадавікі, і працавалі гэтак жа аддана, як і яны, дык краіна падвоіла б зборы з палёў і ферм. Чаму ж гэтага не адбываецца? Што перашкаджае відавочнаму прагрэсу? Гэта ўжо другая тэма для сур'ёзнай размовы.

У дзень свята будуць сказаны многія цёплыя словы на адрас работнікаў сельскай гаспадаркі. Мы шчыра далучаемся да іх.

Але хацелася б і дабавіць. А дакладней кажучы, звярнуцца да хлебарабоў і спытаць у іх: няўжо ім не надакучыла такое жыццё і такія трафарэтныя, падсалоджаныя размовы ў гэты дзень? Ці не час ужо спытаць у традыцыйных аратараў пра тое, што ўсіх нас моцна турбуе.

Алесь ДРАБЧУК.

Одним абзацем

Можно и без БПСМ?

Вопреки утверждениям "чэсных" СМИ, молодежные организации не ограничиваются в Беларуси и, в частности, на Витебщине пресловутым "патриотическим союзом". На днях представители независимых молодежных организаций из Витебска, Орши, Глубокого и других городов области собрались вместе, чтобы обсудить будущую совместную деятельность. Для начала решено было создать координационный центр.

Мальчиков — для битья?

Депутаты Витебского горсовета создали общественный комитет "Телезрители — за НТВ", возглавил который Игорь Нестеров. Комитет начал собирать подписи граждан для заслушивания в городском и областном Советах вопросов о деятельности облтелерадиообъединения, а также о соответствии занимаемым должностям лиц, допускающих пренебрежение мнением народа. Председатель ТРО В.Мальчиков отказался встречаться с членами общественного комитета, а также присутствовать на заседании президиума горсовета. Не позавидуешь ему — поди докажи настырным депутатам, что не по своей воле убрал с вечернего эфира заставку НТВ!

Кто ищет — тот всегда найдет

Подпольный арсенал обнаружили сотрудники Октябрьского РОВД Витебска на квартире неработающего молодого человека, числящегося членом одного из поисковых отрядов. Парень на местах былых сражений искал как полагается — у него были изъяты карабин Мосина, куча патронов, тротиловая шашка и несколько детонаторов от мин.

Евгений ТОМОВ.

Криминал?

Валерий Щукин узнал, что против него возбуждено уголовное дело. За оскорбление президента...

Как оказалось, возбуждено оно аж 26 сентября сего года. С тех пор прокуратура Советского района г.Минска "не могла" найти самого, считай, известного в республике демонстранта, пока он сам не пришел к обвинителям...

Соб.инф.

Погода

15 и 16 ноября на территории республики сохранится облачная с прояснениями погода. 15 ноября по западной половине пройдут дожди, местами сильные; 16 ноября по восточной половине осадки, в западных районах на дорогах гололедица. Температура ночью 15 ноября +1...+6, днем — +4...+9, по востоку ночью +6...+11, днем — +8...+13,
16 ноября ночью -2...+3, днем +1...+6.

Параллели

Заболела Анна Михайловна Титенкова, а пострадал хурург Александр Сергеевич Козлов

Как сообщил редакции из городского поселка Кличев Могилевской области надежный источник, 12 ноября вечером в местной районной больнице развернулась скоротечная драма.

В деревне Поплавы, что примерно в четырех километрах от Кличева, плохо почувствовала себя мать братьев Титенковых семидесятидвухлетняя Анна Михайловна. Кличевский мэр Николай Иванович Титенков первым поспешил на помощь родительнице. Из Минска был сам Иван Иванович Титенков — Управляющий делами президента. Третий Иванович, имени которого местные жители не знают, примчался из Бобруйска, где, говорят, работает каким-то начальником.

Заболевшую мать трое сыновей доставили в районную Кличевскую больницу, расположенную на пересечении улицы Красноармейской и переулка Кривоноса. Дело было вечером, часов в восемь. Дежурил по больнице главврач Станислав Васильевич Сторожун, и, как наблюдал весь медперсонал, ради матери высоких начальников все лечебное учреждение было поставлено на уши.

А.М.Титенковой ставили диагноз в отделение неврологии, которое находится на втором этаже одного из зданий больничного городка. В этом же здании располагается общежитие для медиков. Не занятые на работе и готовившиеся к отдыху обитатели общежития с изрядным удивлением смотрели на скопившиеся во дворике больницы пять милицейских машин с мигалками и приезжую реанимационную машину. Там в жизни такого столпотворения и суматохи не видали...

Молодой хирург-анестезиолог Александр Сергеевич Козлов, потрясенный, как и другие, развернувшимся зрелищем, решил запечатлеть его. Он несколько раз щелкнул "Кодаком" со вспышкой...

Пока родные и медики заботились о пожилой женщине, у молодого человека в комнате общежития бесчинствовали омоновцы. У хирурга отобрали фотоаппарат, пленку, провели беглый несанкционированный обыск. После налета, ничего не понимая, но ожидая худшего, врач "укрылся" где-то в помещении больницы. Но приближалась ночь, и надо было возвращаться.

Мать Титенковых увезли, как поняли кличевцы, в Минск.

Дома анестезиолога А.С.Козлова уже поджидал начальник Кличевского РОВД Н.И.Торгоня. Опять же без санкции уже местная милиция провела еще один, более тщательный обыск. Нашли банку со спиртным местного производства... У хирурга допытывали, на кого работал — образно говоря, на ЦРУ или какую-либо "желтую газету".

В Минске Анну Михайловну, надо полагать, если привезли, поместили в лечебное учреждение сообразно чину сына Ивана.

Утром 12 ноября молодому хирургу Александру Сергеевичу приказали убираться прочь из общежития.

Вот и вся простая житейская история.

Дай Бог пожилой женщине скорее поправиться. Не тот, наверно, случай, когда надо развивать тему о том, что ее ровесницам из простонародья не стоит ждать подобного уровня медицинского обслуживания у себя в глубинке, где для пожилых людей в районной больнице нет жизненно необходимых лекарств.

Но все же, господа, даже спасая жизнь родне, нужно ли так грубо и жестоко топтать судьбы нечаянно подвернувшихся вам под ноги простых беззащитных людей?

Людмила МАСЛЮКОВА.

Субота — лепшы дзень для падпіскі на "Народную волю"

Сёння — выхадны, і ў Вас ёсць магчымасць зайсці на пошту, у любы іншы пункт і падпісацца на "Народную волю" на першую палову 1998 года.

Амаль усе газеты падняялі кошт падпіскі, у "Народнай волі" — без змяненняў. Што сёння 29.000 рублёў? На добры абед не хопіць. А за такую суму Вы зможаце атрымліваць "Народную волю" цэлы месяц. Кошт падпіскі на квартал — 87.000 рублёў, на паўгоддзе — 174.000.

Не заўважыце, як закончыцца падпісная кампанія. Спяшайцеся, не спазніцеся!

Вы — з "Народнай воляй"!
"Народная воля" — з Вамі!

Стоп-кадр

Конкурс профессионального мастерства "Волшебницы дороги" собрал в Витебске участниц со всей области. Впрочем, девушки обязаны были продемонстрировать не только свое профессиональное мастерство, но и артистические, кулинарные и даже спортивные достоинства. Вне конкуренции, по мнению авторитетного жюри, была билетный кассир станции "Витебск" Ирина Филатова, получившая титул королевы.

На снимке: *призеры конкурса.*

Фото Василия РЕПЕЦКОГО.

Собственный корреспондент "Народной воли" Леонид Череповицкий передает из Федеративной Республики Германии

Россией, считает генерал Лебедь, управляет вчерашняя номенклатура

Во Франкфурте-на-Майне на Международной книжной выставке представил свою автобиографическую книгу "Путь России" российский генерал Александр Лебедь. Российского гостя пришел поприветствовать лидер от социал-демократов Оскар Лафонтен. Он спросил московского политика о будущем отношений между Россией и Европой. "Войны между немцами, русскими и французами могли бы опустошить Европу", — ответил бывший генерал. Для развития тесного сотрудничества между этими тремя нациями "не надо жалеть сил". Александр Лебедь предложил создать "стабильный треугольник Берлин — Москва — Париж", на который "могла бы опереться Европа". "Такой треугольник гарантировал бы мир на континенте", — сказал Лебедь. Он говорил о создании "сильной демократической России без претензий на мировое господство". Однако сегодня, считает Лебедь, страной управляет вчерашняя номенклатура: государственный аппарат связан с организованной преступностью, народ обворовывают, царят бюрократический беспредел и дикая налоговая политика, отсутствует цивилизованное законодательство. Страна, как отметил Лебедь, превратилась сегодня в огромную Колумбию. При таких условиях не может быть и речи о свободных выборах. "Россия исчерпала лимит глупости", — сказал он.

Надо отметить, что книга Александра Лебедя вызвала интерес у немцев.

Немцы бесплатно не работают

После длительного перерыва немецкие профсоюзы вновь объявили борьбу за повышение заработной платы. "Уже давно пора забыть о скромности", — заявил председатель профсоюза металлургической промышленности Клаус Цвикель. Профсоюзы требуют повышения зарплаты на пять и более процентов. По мнению лидеров профсоюзов, заработок должен в своем росте опережать инфляцию, а политика, направленная на сдерживание роста зарплаты, не должна превращаться в затяжное явление.

Нужны ли такие гости?

Правящая коалиция CDU-CSU планирует урезать до минимума возможности для иностранцев работать в Германии. Уже принят целый комплекс мер, призванных практически ликвидировать сезонных рабочих. Усиливается контроль в консульствах ФРГ в восточно-европейских странах по выдаче гостевых виз. Должны быть введены новые формуляры для приглашений.

Соискателям политического убежища предусмотрено разрешение на работу вообще не давать. Также планируется ужесточение контроля по соблюдению этого положения. Наказание предпринимателям, использующим иностранцев для нелегальной работы, будет увеличено со 100 тыс. немецких марок штрафа (сейчас) до 500 тысяч. Социал-политический представитель CSU Петер Рамсауэр сказал, что "ежегодно 250 тысяч иностранцев перегружают рынок рабочей силы в ФРГ. Этому потоку будет положен конец". Представитель CDU Юлиус Лоувэн подчеркнул, что "многие русские и восточные европейцы используют приглашения, чтобы работать в Германии. Мы остановим эти злоупотребления".

P.S. *Ни разу не приходилось слышать, чтобы немцы, приехавшие в другую страну по гостевой визе, стали бы там тайно подрабатывать... О туристах, работающих "по-черному" в ФРГ, будет подготовлен материал в одной из ближайших подборок.*

УКАЗ
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
№580

Аб святкаванні 200-годдзя з дня нараджэння паэта Адама Міцкевіча

1. Арганізаваць у 1997—1998 гадах у Рэспубліцы Беларусь мерапрыемствы, прысвечаныя святкаванню 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у двухмесячны тэрмін утварыць арганізацыйны камітэт і падрыхтаваць план мерапрыемстваў па святкаванні 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча.

3. Міністэрству фінансаў выдзеліць у 1997—1998 гадах з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Брэсцкаму аблвыканкаму 5 млрд. рублёў і Гродзенскаму аблвыканкаму 30 млрд.рублёў для правядзення мерапрыемстваў, звязаных са святкаваннем 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча.

4. Міністэрству культуры забяспечыць у верасні 1998 г.:

сумесна з Брэсцкім аблвыканкамам адкрыццё музея-сядзібы Адама Міцкевіча ў в. Завоссе Баранавіцкага раёна;

сумесна з Гродзенскім аблвыканкамам правядзенне міжнароднага свята паэзіі.

5. Гэты Указ увесці ў дзеянне з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А.Лукашэнка.

11 лістапада 1997 г.
г.Мінск.

Беларуская апазіцыя рыхтуе акцыі да ўгодкаў усенароднага апытання (рэферэндуму)

Графік правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных першым угодкам рэферэндуму 1996 года, зацверджаны на пасяджэнні аргкамітэта на чале са старшынёй Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання Сямёнам Шарэцкім. Паводле звестак БелаПАН, у праграме мерапрыемстваў — правядзенне маніфестацый, мітынгаў, пасяджэння Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання аб выніках працы за мінулы год, навуковых канферэнцый і шматлікіх пікетаў.

Асаблівая ўвага на пасяджэнні аргкамітэта была нададзена давядзенню інфармацыі аб гэтых мерапрыемствах да грамадзян рэспублікі, у сувязі з чым вырашана вярнуцца да метадаў прапагандысцкай работы — прамых кантактаў з насельніцтвам, асабістых зносінаў і інш.

Галоўны мітынг у Мінску даручана весці намесніку старшыні Вярхоўнага Савета 13-га склікання Генадзю Карпенку. Аргкамітэт мае намер таксама каардынаваць свае намаганні з арганізатарамі руху "Хартыя-97".

Уладзімір ГЛОД.

Кадры

Прызначаны новы старшыня Камітэта дзяржкантролю па Магілёўскай вобласці

Новым старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю па Магілёўскай вобласці замест загінуўшага Яўгена Мікалуцкага прызначаны Сямён Соц.

Сямёну Соцу 41 год, ён выпускнік Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Апошняе месца працы — старшыня рэгіянальнага камітэта дзяржкантролю ў Пінску (Брэсцкая вобласць).

Аляксандр АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Шчыра!

Будучыня нашай дзяржавы залежыць ад нас, сённяшніх школьнікаў...

Добры дзень, паважаная рэдакцыя "Народнай волі"! Нядаўна прайшлі дні, якія звязаны з 115-мі ўгодкамі з дня нараджэння вялікага паэта нашай Радзімы — Якуба Коласа і 480-годдзем з дня выдання Ф.Скарынай "Псалтыра". У гэтыя дні я шмат аб чым разважаў. У тым ліку і аб тым, як нам, як казаў класік, людзьмі звацца.

Я вучань 8-га класа сярэдняй рускамоўнай школы. З дня незалежнасці Беларусі я размаўляю на роднай мове. Узрыманне мяне дзецьмі на вуліцы было такое, што яны сустракалі мяне словамі "колхозник", "дзярэўня" і цытаннем: "Ты што, беларус?!" Такое ж успрыманне было і ў школе. Але я вытрымаў гэта, не звяртаючы ўвагі на гэтых манкуртаў — людзей, якія не ведаюць, цураюцца роднай мовы. Па-іншаму іх не назавеш. І мне соромна за тых, хто не паважае родную мову і гісторыю сваёй Радзімы.

Я хачу звярнуцца да вучняў усіх школ. Не цурайцеся сваёй мовы, а наадварот, пераходзьце хутчэй на мову нашых продкаў, бо яна нам засталася ў спадчыну. Усе павінны ведаць, што будучыня нашай краіны ў асноўным залежыць ад нас, вучняў школ, а каб краіна не знікла, трэба, каб заўсёды жыла яе мова. Я хацеў бы выказаць пажаданне галоўнаму рэдактару і заснавальніку газеты "Народная воля" Іосіфу Сярэдзічу. Было б добра, калі б Ваша газета друкавалася толькі на роднай беларускай мове і каб друкавалася ў Беларусі, у Мінску.

Скончыць сваё пісьмо я хацеў бы словамі выдатнага паэта, патрыёта Беларусі Алеся Гаруна:

"Дык шануй, Беларус, сваю мову —
Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацця-народы".

Віталь ЗЫБЛЮК,
14 год.
г.Мінск.

Ад рэдакцыі. *Што ні кажыце, а прыемна атрымліваць падобныя лісты. Калі падрастаюць такія маладыя людзі, як Віталь Зыблюк, значыць, ёсць у Беларусі будучыня. А што датычыцца "Народнай волі", то рэдакцыя прыбліжае той дзень, калі газета будзе друкавацца не на "саляцы", а толькі на роднай мове.*

Народная Воля 15 ЛІСТАПАДА 1997 г.

Спорт

Футбол

Падвядзенне вынікаў

Апошні тур сёмага чэмпіянату Беларусі па футболу даў адказ на пытанне, якія ж дзве каманды ў гэтым сезоне пакінуць першую лігу. Пасля паражэння ад мінскага "Дынама-93" з лікам (0:4) салігорскі "Шахцёр" заняў апошні радок турнірнай табліцы. А магілёўскае "Тарпеда-Кадзіна" хоць і выйграла свой заключны матч у МВКЦ (3:1), але ўсе ж складзе кампанію гарнякам — асноўныя канкурэнты аўтазаводцаў таксама атрымалі перамогі і захавалі месцы ў лізе мацнейшых. "Трансмаш" (Магілёў) перагуляў слонімскі "Камунальнік" — 2:0, а "Маладзечна" было мацнейшае за наваполацкі "Нафтан-Дэвон" — 3:2. У наступным сезоне аўтсайдэраў заменяць барысаўскі БАТЭ і "Гомель".

З вынікаў іншых сустрэч 30-га тура трэба адзначыць другое паражэнне ў чэмпіянаце мінскіх дынамаўцаў. У Гродне, куды новаспечаныя чэмпіёны прыбылі на гульню з мясцовым "Нёманам", быў вельмі моцны туман, і матч ледзь не адмянілі. Аднак, хоць і са спазненнем, гульня пачалася і гаспадары, лепш прыстасаваўшыся да складаных умоў надвор'я, перамаглі мінчан з лікам 2:1.

У астатніх сустрэчах зафіксаваны наступныя вынікі: "Днепр" (Магілёў) — "Атака" (Мінск) — 2:0; "Дынама" (Брэст) — "Лакаматыў-96" (Віцебск) — 3:1; "Тарпеда" (Мінск) — "Белшына" (Бабруйск) — 1:0.

У спрэчцы бамбардзіраў лепшы паказчык у Андрэя Хлебасолава з "Белшыны" — 19 мячоў. 16 трапных пападанняў у мінскага дынамаўца Уладзіміра Макоўскага, па 15 разоў вызначыліся Дзмітрый Балашоў ("Белшына"), Андрэй Турчыновіч ("Дынама-93") і Уладзімір Саладухін з "Дняпра". Апошні, дарэчы, можа папоўніць галявы запас у адкладзеным матчы сваёй каманды з "Нёманам".

Хакей

У госці да "Паліміра" прыедуць суседзі

Чэмпіён Беларусі па хакею наваполацкі "Палімір" рыхтуецца да паўфінальнага турніру розыгрышу Кантынентальнага кубка.

У сваім Палацы спорту і культуры з 15 па 17 лістапада новаполачане будуць прымаць тры каманды з былога СССР — расійскія "Салават Юлаеў" (Уфа) і "Металург" (Магнітагорск), а таксама чэмпіёна Латвіі рыжскі "Юніярс". Каб трапіць у фінальную стадыю розыгрышу новага еўрапейскага трафея, неабходна заняць першае месца ў гэтым квартэце. Што датычыцца шанцаў каманд, то, паводле ацэнак спецыялістаў, яны лепшыя ў "Металурга", які цяпер знаходзіцца ў лідэрах чэмпіянату Расіі. А вось беларусы пакуль не ў лепшай сваёй форме і займаюць толькі чацвёртае месца ў чэмпіянаце Усходнееўрапейскай хакейнай лігі, адстаючы ад рыжан, якія на трэцім месцы, на тры ачкі.

Ігар ХАДАСЕВІЧ.

У Нагана адправіцца цэлая сотня беларускіх надзей

Рэкорднай колькасцю ўдзельнікаў на зімовых алімпійскіх гульнях у Нагана будзе прадстаўлена наша рэспубліка. Па дзесяці відах спорту — біятлону, лыжных гонках, гарналыжнаму спорту, двяабор'ю, скачках з трампліна, фігурнаму катанню, фрыстайлу, шорт-трэку, канькабежнаму спорту і хакею — выступяць 103 спартсмены. Самая прадстаўнічая кампанія ў хакеістаў — 39 чалавек, у гарналыжнікаў — адзін Ігар Юдзін.

Сярод найбольш тытулаваных — "страляючыя лыжнікі" Святлана Парамыгіна, Ірына Тананайка, Алег Рыжанкоў, Вадзім Сашурын, Аляксандр Папоў, Пётр Івашка. З імі звязваюцца асноўныя надзеі на алімпійскія ўзнагароды. А ў Нагана будзе разыграна 68 камплектаў медалёў.

Вячаслаў ДУТАЎ, БелТА.

Стоп-кадр

Браслаўшчына.

Фота Яўгена КОКТЫША.

Поиск

Ищем родственников в Беларуси

Семья Пшибылинских жила в Польше, но в 1910 г. переехала из г.Люблина в Беларусь — н/п Старево около Слуцка. Викентий Пшибылинский, по профессии инженер-стекольщик, и его жена Мария, урожденная Лодозынска, имели много детей: Феликс, Хенрик, Броня и Богуслава, другие имена неизвестны. Известно только, что Богуслава вышла замуж за Яника Зеновенка. У одного из братьев в 1923 г. родился сын, который предположительно также носил фамилию Пшибылинский. Вторая мировая война разлучила Хендрика Пшибылинского с семьей в 1942—1943 гг. и волей судьбы он попал в Англию. В настоящее время его сын Виктор Пшибылинский разыскивает своих родственников в Беларуси.

Елена ДАШКЕВИЧ, руководитель Службы розыска Белорусского Красного Креста.

І такое бывае

У клубе "пасялілася" царква

У пасёлку Седча, што ў Пуховіцкім раёне, адкрылася царква. Адметна тое, што яна размясцілася ў сельскім клубе.

Да савецкай улады ў вёсцы быў храм. Але ў гады барацьбы з рэлігіяй яго ператварылі ў збожжавы склад, а потым зусім зруйнавалі. І вось цяпер па просьбе жыхароў мясцовы клуб стаў царквой. Бо ён заўсёды пуставаў.

Што ж, народ заўсёды прыме разумнае рашэнне. Не трэба толькі яму перашкаджаць.

Ігнат ПЯТРОВІЧ.

Памежжа

Кантрабанда жывым таварам прывяла на нары

Больш за 70 крымінальных спраў у адносінах да 118 парушальнікаў дзяржаўнай граніцы ўзбуджана з пачатку гэтага года ў Беларусі. І вось нядаўна Гродзенскі раённы суд закончыў разгляд яшчэ адной справы ў адносінах да грамадзяніна Азербайджана Р.Рустамава і двух грамадзян нашай краіны — А.Барынава і І.Мілюця, якія спрабавалі незаконна пераправіць праз беларускую граніцу шасцярых грамадзян Індыі.

А пачалося ўсё ў Маскве. Атрымаўшы з кожнага індуса па адной тысячы долараў, Рустамаў прывёз мігрантаў у Гродна, дзе пасяліў іх на кватэры ў Барынава. Пражыўшы там тры дні, індыйскія "турысты" прыехалі ў госці да Мілюця, чый дом побач з граніцай. Заначаваўшы ў гасціннага гаспадара, індусы адправіліся "на штурм" беларускіх рубяжоў, дзе і сустрэліся з пагранічнікамі.

Пасля разбору парушальнікаў адправілі назад у Маскву, а канфіскаваныя грошы паступілі ў казну дзяржавы. Што ж датычыць памочнікаў нелегалаў, то іх пакаралі больш сурова. Суд прыгаварыў Рустамава да пяці, а Барынава і Мілюця да двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі строгага рэжыму.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Прыватызацыя

3. У краіну, дзе парушаюцца правы чалавека, замежны інвестар не спяшаецца

Спецыялісты гавораць, што малая прыватызацыя — люстэрка эканамічных рэформ дзяржавы. Калі гэта так, дык варта ўважліва паглядзець у такое люстэрка, тым больш што малая прыватызацыя ў Беларусі вядзецца з 1993 года пры садзейнічанні спецыялістаў Міжнароднай фінансавай карпарацыі. Дык што ж высвечвае гэтае люстэрка?

З мая 1993 года па запрашэнні ўрада Беларусі Міжнародная фінансавая карпарацыя (МФК) аказвае нашай краіне дапамогу па правядзенні малой прыватызацыі. Дзякуючы фінансаванню праекта Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці, гэтая работа з'яўляецца бясплатнай і мае форму тэхнічнай дапамогі гарадам пры падрыхтоўцы і правядзенні аўкцыёнаў па продажы аб'ектаў камунальнай уласнасці.

Цяпер дапамогу спецыялістаў МФК атрымліваюць гарады Брэст, Гродна, Орша, Мінск, Кобрын, Ліда і іншыя. Днямі дагавор аб супрацоўніцтве з гэтай арганізацыяй падпісаў Магілёў, стаўшы ўжо дванаццатым горадам краіны, які далучыўся да праекта "Малая прыватызацыя Беларусі".

Пры тэхнічнай падтрымцы спецыялістаў МФК праведзена болей 200 аўкцыёнаў, на якіх прыватызавана звыш 420 аб'ектаў. Дзяржаўная казна займела 11,1 мільёна долараў.

Практыка паказала, што самым эфектыўным спосабам правядзення прыватызацыі з'яўляецца аўкцыён. На ім дасягаецца галоснасць і адкрытасць, роўныя магчымасці для ўсіх удзельнікаў, вызначэнне сапраўднай (рынкавай) цаны аб'екта, забеспячэнне максімальных паступленняў у бюджэт... Але, бадай, яго самая галоўная перавага ў тым, што ў ходзе прыватызацыі прадпрыемства набывае больш талковага гаспадара.

Ажыццяўляецца ў нас і праект "Падтрымка прыватнага прадпрымальніцтва ў Беларусі". Ён фінансуецца Брытанскім фондам ноўхау і з'яўляецца працягам дзейнасці Міжнароднай фінансавай карпарацыі. Асноўная мэта праекта — аказанне бясплатнай дапамогі развіццю беларускага прадпрымальніцтва. Падтрымка аказваецца ў такіх формах, як навучанне кіраўнікоў малога бізнесу, прадастаўленне прадпрымальнікам усёй неабходнай інфармацыі аб таварах і рынках, а таксама правядзенне кансультацый у галіне бізнес-планавання і гаспадарчага права. Уся работа праводзіцца ў спецыяльна ствараемых бізнес-цэнтрах. Такія цэнтры ўжо дзейнічаюць у Брэсце і Гродне. Брэст не выпадкова выбраны першым горадам для ажыццяўлення згаданага праекта. Тут ужо каля паловы ўсіх аб'ектаў камунальнай уласнасці прыватызаваныя. Значыць, з'явілася шмат новых уласнікаў, якія маюць патрэбу ў навучанні і кансультацыях. І таму адкрыццё тут бізнес-цэнтра, як кажуць, наспела.

МФК падсабляе і рэфармаванню жыллёва-эксплуатацыйнай гаспадаркі, а дакладней, стварэнню кандамініўмаў — таварыстваў уласнікаў дзеля сумеснага домаўладання. Гэта даволі важная і перспектыўная справа. Утрыманне жылля ў нас, мякка кажучы, жадае лепшага. Дастаткова зазірнуць у многія пад'езды і ліфты, каб пераканацца, у якім яны непрывабным выглядзе. А тут яшчэ скарачаюцца дзяржаўныя датацыі на рамонт жылля.

Хто ж зможа падтрымліваць чысціню і парадак у пад'ездах, перадаць дамы нашым дзецям у добрым стане? Вядома ж, самі жыхары, аб'яднаўшыся ў таварыствы. Пасля гэтага іх плата за кватэры ідзе не ў кантору, якая накіроўвае такія сродкі на "затыканне дзірак", а на рахунак таварыства, і яно само вырашае, куды іх накіраваць. Так што твае кроўныя рублі ўжо не пойдуць на рамонт даху чужога дома, а будуць выкарыстаны на афарбоўку сцен уласнага пад'езда ці ўстаноўку дзвярэй з кодавым замком.

Кандамініўмы атрымалі шырокае развіццё ў Францыі, Вялікабрытаніі, Іспаніі, Польшчы... Кожны восьмы амерыканец уваходзіць у жыллёвыя асацыяцыі. Кандамініўмы складаюць 10% усяго жыллёвага фонду ў Вашынгтоне, 15% — у Фларыдзе, 21% — на Гавайях. Па шляху стварэння сумесных домаўладанняў ідзе рэфармаванне жыллёвай сферы ў Расіі, Літве і на Украіне.

У сакавіку 1995 года пры садзейнічанні МФК Брэсцкі гарвыканкам упершыню ў Беларусі распрацаваў і зацвердзіў Палажэнне аб сумесным домаўладанні (кандамініўме). Цяпер такія дакументы прынятыя ўжо ў Кобрыне, Баранавічах, Ваўкавыску, Бярозаўцы Лідскага раёна, Гомелі, Оршы, Маладзечне, Мінску. Першая асацыяцыя ўласнікаў жылля была створана ў Брэсце ў чэрвені 1995 года. Затым яны ўзніклі ў другіх гарадах.

Так што наступ новага ідзе на многіх накірунках. Але агульныя вынікі пакуль даволі сціплыя. Бо малая прыватызацыя выявіла вялікія праблемы на сваім шляху. Вось адна з іх. Многія магазіны, кафэ размешчаны на першых паверхах жылых дамоў ці іншых будынкаў альбо ў памяшканнях, прыбудаваных да іх. Прыватызаваўшы такі магазін ці кафэ, новы ўладальнік застаецца арэндатарам займаемага памяшкання. Таму, аддаўшы немалыя грошы ў час выкупу аб'екта, ён працягвае плаціць арэндную плату, якая мае ўласцівасць увесь час павялічвацца. Вядома, дзяржава імкнецца з усяго выкачаць паболей грошай, але такая практыка, як кажуць, пераходзіць ужо ўсе межы.

Нарэшце, як прадаць такое кафэ, калі спатрэбіцца ці "прыпруць" абставіны? Гаспадар кафэ не з'яўляецца гаспадаром памяшкання. Так што з гэтымі "встроенными" памяшканнямі шмат неразбярыхі.

У некаторых гарадах большасць прадпрыемстваў камунальнай уласнасці перайшла на арэнду, плануючы ў будучым выкупіць арэндаваную маёмасць. На першым этапе гэта быў прагрэсіўны крок. Але падатковая пятля, якую дзяржава накінула на вытворчыя калектывы, не дае ім магчымасці здзейсніць задуманае, бо няма грошай на выкуп арэндаванай маёмасці. У выніку яна не ўключана ў рынак нерухомасці. Кола замкнулася, і калектывы спыніліся на паўкроку да рынку. І ні туды, і ні сюды.

Не зжытыя выпадкі, калі імкнуцца прадаць аб'ект "добраму чалавеку" альбо працоўнаму калектыву. У такім разе яны збываюцца даволі танна. Значыць, дзяржаўны бюджэт атрымлівае мала грошай, які не хапае на добрую пенсію ветэранам, а прадпрыемства атрымлівае не лепшага гаспадара, які часцей завальвае работу, што параджае новыя эканамічныя цяжкасці. У рэшце рэшт такі аб'ект прыходзіцца выстаўляць на аўкцыён — гэта значыць зноў пачынаць спачатку. А час упушчаны, сродкі загублены.

Гледзячы на табліцу, якая адлюстроўвае вынікі аўкцыёнаў па продажы аб'ектаў камунальнай уласнасці, позірк адразу спыняецца на графе "Замежныя ўдзельнікі". Тут адны нулі. Не хочуць заходнія інвестары ўдзельнічаць у нашай прыватызацыі і ўсё. Нягледзячы на салодкія запрашэнні беларускіх улад і пэўныя ільготы. Так, згодна з заканадаўствам, сумесным прадпрыемствам з долей устаўнога капіталу замежнага інвестара больш за 30% прадастаўляюцца такія ільготы: без ліцэнзій экспартаваць прадукцыю ўласнай вытворчасці і імпартаваць тавары для ўласнай гаспадарчай дзейнасці; на працягу трох гадоў прадпрыемства вызваляецца ад уплаты падатку з прыбытку. Калі ж прадпрыемства выпускае асабліва важную для Беларусі прадукцыю, дык яно можа быць вызвалена яшчэ на тры гады ад уплаты 50% падатку з прыбытку і атрымліваць у арэнду зямельныя ўчасткі для пашырэння і мадэрнізацыі вытворчасці.

Але замежныя інвестары да нас не ідуць. І, відаць, у бліжэйшы час не пойдуць. Бо туды, дзе парушаюцца правы чалавека, салідны інвестар ніколі не пойдзе.

Такім чынам, беларуская малая прыватызацыя, набраўшы разгон і паказаўшы свае перавагі, адразу ўпёрлася не толькі ў густаплеценыя рагаткі, але і такую таўшчэзную камуністычна-бюракратычную і палітычную сцяну, адолець якую наўрад ці змогуць разведчыкі з МФК, фонда ноу-хау і іншых падобных устаноў. Бо ў нас побач з прыватызацыяй цвіхарка ідзе і будаўніцтва "камуністычнага запаведніка". Гэта, відаць, і ёсць так званы "рынкавы сацыялізм", пры якім краіна адначасова ідзе ў двух супрацьлеглых накірунках — уперад і назад. Але ж гэта самы неперспектыўны варыянт, бо ён не прадугледжвае ніякага руху.

Іван МАКАЛОВІЧ.

"Каляровым шклом" асвечана гісторыя

Грамадскасць Беларусі адзначыла Дзень незалежнасці Польшчы

Даўно ўжо не было так шматлюдна ў Доме дружбы, як у гэты вечар. Адзначыць юбілей суседняй Польшчы сабралася на дзіва шмат людзей. Тут былі і вядомыя навукоўцы, дзеячы культуры, такія як дырэктар Інстытута гісторыі Акадэміі навук Міхаіл Касцюк, мастакі Уладзімір Стальмашонак, Аляксандр Зубрыцкі, старшыня Беларускага таварыства дружбы з замежнымі краінамі, Арсен Ваніцкі і многія іншыя. І што яшчэ кінулася ў вочы. Сярод гасцей было шмат моладзі.

Людзі стаялі нават у праходах. На вечарыне прысутнічалі саветнік пасольства Рэспублікі Польшча ў Беларусі Станіслаў Гурчыньскі, консул Вальдэмар Мендзелеўскі. З кароткім дакладам выступіў вядомы навукавец Чэслаў Бенькоўскі. Слова браў Станіслаў Гурчыньскі і многія ўдзельнікі.

Прамоўцы нагадалі, што пасля вядомых трох падзелаў Рэчы Паспалітай Польша згубіла самастойнасць, трапіла, як і Беларусь, у склад Расійскай імперыі. Няволя цягнулася доўгія 123 гады і зрабіла вельмі цяжкі адбітак на жыцці ўсяго грамадства. Здавалася, ёй ніколі не вырвацца з імперыі, не адрадзіць сваю дзяржаву. Вядучыя палітычныя сілы краіны ўжо змірыліся з такім лёсам. Шляхта турбавалася толькі аб уласным дабрабыце. Нацыянальна-дэмакратычны рух выступаў за адраджэнне польскай дзяржавы ў... рамках расійскай імперыі. І толькі вялікі сын народа Пілсудскі і яго аднадумцы з руху сацыялістаў верылі ў свабодную Польшчу. Ён вылучыў галоўны накірунак змагання за свабодную Польшчу — падрыхтоўка да "сусветнага пажару", які ўжо быў на гарызонце і выкарыстаць яго ў інтарэсах сваёй дзяржавы, а пакуль ствараць сілы барацьбітоў. Хутка ў падполлі было каля 10 тысяч сыноў, гатовых узяць зброю для барацьбы за Бацькаўшчыну. І такі час наступіў. 11 лістапада 1918 года ваяры Пілсудскага ўзялі ўладу ў краіне і пачалі адраджаць сваю дзяржаву.

Дарэчы, тады і Беларусь мела рэальны шанс стаць самастойнай дзяржавай. І яна аб'явіла сваю незалежнасць 25 сакавіка. Але тут былі больш моцныя прарасійскія сілы, якія сумесна з бальшавікамі задушылі маладую рэспубліку. Польшча выстаяла ў цяжкай барацьбе. Аб гэтым сведчаць шматлікія помнікі на беларускай зямлі. Ім і прысвяціў мастак Аляксандр Зубрыцкі свае палотны, якія былі выстаўлены ў Доме Дружбы і выклікалі непадробную цікавасць прысутных.

Дарэчы, гэты арыгінальны мастак "малюе" каляровым шклом, што надае яго творам непаўторны каларыт. Сам ён урач, кандыдат медыцынскіх навук. На 18 карцінах, прадстаўленых у Доме дружбы, адлюстраваны найбольш значныя помнікі польскага змагання за сваю незалежнасць, якія знаходзяцца на беларускай зямлі. Ёсць яны і ў Баранавічах, і ў Вілейцы, і ў Валожынскім раёне... Іх беражліва захоўваюць мясцовыя жыхары, хоць некаторыя ўжо ў запусценні. Але ж гэта наша агульная гісторыя, якая жыве ў сэрцах простых людзей і якую нікому не ўдасца выкарчаваць.

На вечарыне з вялікім поспехам выступіў ансамбль з Беларускага універсітэта культуры, які з натхненнем выканаў паланез Агінскага, кракавяк, лявоніху, папуры з французскіх, кубінскіх, іспанскіх, фінскіх мелодый.

Алесь ДРАБЧУК.

Житейская тема

Уж замуж невтерпеж

Сегодня организация свадьбы стоит от пятисот долларов до пяти тысяч. Кто-то ухитряется уложиться в меньшую сумму, а кто-то, наоборот, гуляет с размахом, когда свадьбе и "места мало, и неба... и земли".

Итак, вы решили пожениться. Соединить себя законными узами с любимым человеком. В принципе, решение разумное. Но не спешите восторженно восклицать, представляя себя идущей в шикарном белом платье под руку с женихом по мраморной лестнице Дворца бракосочетаний. Путь к вершинам Гименея не такой простой и безмятежный, как кажется.

Все начинается, как правило, с загса. Только расписывают вас не тогда, когда вы захотите, а когда очередь подойдет. Ждать приходится обычно три месяца после подачи заявления, иногда меньше — в тех случаях, когда идущих под венец немного и очереди в загсе нет.

Подача заявления — это как отправная точка, после чего начинаются основные приготовления к свадьбе. В срочном порядке надо купить обручальные кольца, наряд для невесты, костюм для жениха, составить список приглашенных и познакомить родителей. Кстати, последнее мероприятие очень ответственное. За один вечер мамам и папам новоявленных молодоженов надо не только поближе познакомиться и как можно корректнее выяснить родословную будущих родственников своего дитяти, но и решить организационные вопросы, главный из которых — где устраивать банкет.

Сегодня зачастую свадьбы справляются скромные, нешумные. В обычную квартиру втискиваются человек пятьдесят гостей, и после парочки тостов за молодых и торжественного вручения подарков все дружно разбегаются по домам.

Те, кто чуточку побогаче или не один год копил деньги на свадьбу своего чада, стараются устроить банкет попышнее, такой, чтобы запомнился всем гостям. И скорее не для того, чтобы устроить детям запоминающийся праздник, а из-за беспокойства о собственном престиже. Тогда родители заказывают на вечер зал в ресторане или организовывают торжества за городом в каком-нибудь профилактории столичного предприятия (если, конечно, это не время отпусков).

Аренда такого здания со спальными номерами обходится очень дорого. К тому же надо немало потратиться на автобус (долларов 50—100), который должен доставить гостей к месту назначения, и на маленький оркестрик (долларов 200—400), который будет этих самых гостей развлекать.

Свадебный наряд для невесты только в хорошем сне дарит жених. Как правило, его покупают родители вступающей в брак девушки. И уж, конечно, каждая молодая дива мечтает о шикарном белом платье. Сегодня, слава Богу, купить приличное платье несложно. Если у вас есть вкус и минимум 120 долларов, вы можете взять платье напрокат в одной из столичных свадебных контор, объявления об услугах которых пестрят по всему городу. И не торопитесь бежать на Комаровку, где за полтора миллиона "зайчиков" вам предложат некое подобие тюлевой занавески, или заказывать увиденное на обложке импортного журнала обалденное платье в нашем ателье: все равно пошьют не так, как на картинке.

Туфли тоже можно купить без проблем. Были бы денежки. Прическу за 30 долларов вам сделают в любом столичном салоне. Если с финансами тяжело, можно сэкономить на макияже и аккуратно самой подкрасить глаза и подвести губы.

Выбор костюма для жениха — мероприятие тоже ответственное. Надо постараться выбрать такой костюм, который и после собственной свадьбы можно было бы надеть на любое торжество и не выглядеть вызывающе.

Самое главное на свадьбе, конечно же, обручальные кольца. Их приобретение — забота жениха. Если ваш будущий спутник жизни не преуспевающий бизнесмен (во всяком случае, пока) и в день свадьбы собирается дарить не бриллиантовый перстень, а обычное обручальное кольцо, ему придется раскошелиться на миллиона два. В такую минимальную сумму обходятся сегодня два обручальных кольца.

И вот наступает самый долгожданный день в вашей жизни. Еще с утра все поставлено с ног на голову. Невеста не без помощи подруг приводит себя в порядок. Родители организовывают своевременную доставку спиртного к месту проведения банкета. Гости прибывают, свидетели суетятся. И наконец свадебный кортеж торжественно направляется в загс.

Наш загс — разговор особый. Бракосочетают там крайне быстро. Вы даже не успеваете заметить, как обменялись с любимым человеком обручальными кольцами. Минут десять—пятнадцать, и вы свободны, проштампованы и окольцованы. Единственное, что запоминают молодожены, — это марш Мендельсона, под звуки которого они входят в загс. Выходят уже под другую мелодию, более энергичную. Например, под газмановский хит "Мои мысли — мои скакуны".

После процедуры бракосочетания приходит время другого обязательного мероприятия — возложения цветов к памятникам погибшим во время одной из войн солдатам и осмотр достопримечательностей города. И только после этого свадебная процессия с изрядно уставшими виновниками торжества направляется к месту проведения банкета. И уже там, сидя на почетном месте за столом, молодожены понимают, как они устали, и с нетерпением ждут времени наступления первой брачной ночи.

И только на другой день, открывая бутылочку шампанского прямо на брачном ложе, они ощущают себя по-настоящему счастливыми и... женатыми!

Мария ЭЙСМОНТ.

Личное мнение

Осенняя распутица белорусской оппозиции, или Почему не надо бить своих, чтобы чужие боялись

